МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

# «ЛІСТАПАД» АДКРЫВАЕ МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ

**АДНОЙ з адметнасцяў сёлетняга «Лістапада» стала тое, што многія мерапрыемствы ў межах кінафестывалю накіраваны на моладзь: аб гэтым арганізатары конкурсу казалі неаднойчы. Акрамя праграмы «Лістападзіка», дзе былі прадстаўлены стужкі пра сучасных падлеткаў, упершыню ў рамках фестывалю прайшоў маладзёжны форум.**
**Чаму мультфільмы не заўсёды пра дзяцінства і як маладыя бачаць кіно? Разбіраліся разам з удзельнікамі.**

## Усё, што вы хацелі ведаць пра «Смяшарыкаў», але баяліся спытаць

Так аніматар Дзяніс Чарноў нефармальна назваў свой майстар-клас, які прайшоў на кінастудыі «Беларусьфільм». Дзяніс Чарноў стаяў каля вытокаў стварэння «Смяшарыкаў» — вядомага мультсерыяла, які за 20 гадоў вырас да цэлага сусвету. Складана знайсці дзіця і нават дарослага, які не ведае гэтых смешных кругленькіх жывёл. Толькі на першы погляд «Смяшарыкі» падаюцца дзіцячым прадуктам: шматлікія даследаванні, кінаэсэ і разборы крытыкаў сведчаць аб тым, што гэты мультфільм — шматсэнсоўнае разважанне аб чалавеку.

У некаторых серыях можна знайсці візуальныя цытаты на стужкі «Фарэст Гамп» Роберта Земекіса і «Прыгажосць па-амерыканску» Сэма Мендэса, схавалася там і алюзія на савецкі мультфільм «Вожык у тумане» Юрыя Нарштэйна. А на вобраз аднаго з герояў сусвету «Смяшарыкаў», працавітага мядзведзя Капатыча, аўтараў натхніў... акцёр Анатоль Папанаў.

— У многіх серыях мы, як кантрабандысты, хавалі другое дно, аб якім нам было цікава паразважаць, — распавёў падчас сустрэчы Дзяніс Чарноў. — Усё гэта было замаскіравана. Але, безумоўна, ёсць і звычайныя забаўляльныя, камедыйныя серыі.

Падчас майстар-класа гледачам паказалі «Жыццё на вобласку» — серыю, якая распавядае аб клінічнай смерці. Зразумела, што галоўная ідэя завуалявана: калі маленькая аўдыторыя проста ўбачыць гісторыю пра жыццё ў высокіх гарах з прыгожымі аблокамі, то больш дарослы глядач счытае метафару нечаканай катастрофы.

Менавіта дзякуючы разнапланавасці персанажаў і сэнсаў «Смяшарыкі» прыцягваюць людзей розных узростаў. Сведчаннем гэтаму сталі і наведвальнікі майстар-класа: на «Беларусьфільм» прыйшлі як маленькія дзеткі з бацькамі, так і студэнты рэжысёрскіх спецыяльнасцяў. І калі дарослых цікавілі больш тэхнічныя пытанні, напрыклад, пераход фармату з 2D у 3D, то маленькая аўдыторыя задавала пытанні, звязаныя з характарамі герояў і іх хобі. Адно з пытанняў — чаму вясёлае зайчаня Крош заўсёды гуллівае і ці ведаюць яго сябры, што ён гімнаст:

— Разумееце, ён халерык — ёсць такі тыпаж персанажаў, у якіх рукі дзейнічаюць раней за галаву. Мы якраз імкнуліся абвастрыць герояў, зрабіць так, каб кожны з іх валодаў ярка выяўленай характарыстыкай. Але пры гэтым заўсёды выдатна, калі ў героя ёсць яшчэ нешта схаванае. Так той жа энергічны Крош, на мой погляд, — галоўны філосаф ва ўсёй кампаніі. Дваістасць лініі заўсёды надае героям праўдападобнасць, цікавасць і глыбіню, — адзначыў аніматар.

Сустрэча атрымалася карыснай для ўсіх наведвальнікаў: дзеці нарэшце даведаліся, ці было паміж свінкай Нюшай і Барашам узаемнае каханне, а студэнты атрымалі парады па стварэнні характараў персанажаў, прапісванні сюжэтаў і рабоце ў камандзе.

## Беларуская міфалогія, дзіцячыя траўмы і пахаванне

Гэтыя і іншыя тэмы будучых фільмаў прагучалі падчас пітчынгу, што ладзіўся ў рамках маладзёжнага форуму. Удзельнікамі конкурсу сталі студэнты і выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, а таксама Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Хлопцам і дзяўчатам належала за 5 хвілін прэзентаваць сваю ідэю: трэба было не толькі распавесці аб сюжэце і героях стужкі, але і падзяліцца рэферансамі — фільмамі, якія натхнілі; а таксама адзначыць лакацыі, дзе карціна будзе здымацца. Хвалююча. Асабліва калі разумееш, што твой фільм пакажуць у конкурснай праграме «Кіно маладых» на наступным «Лістападзе». У склад журы ўвайшлі генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі, рэжысёр Алена Турава, першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Лук'янаў, а таксама расійскія кінапрадзюсары і рэжысёры.



Фота Лізаветы ГОПАД

Зразумела, што абраць ідэю кожнага немагчыма. Менавіта таму падчас пітчынгу трэба ў першую чаргу зацікавіць журы. Нехта з удзельнікаў скараў яскравай прэзентацыяй, іншыя абралі стратэгію жывога дыялогу — распавядалі са сцэны аб сваёй канцэпцыі і ахвотна адказвалі на пытанні.

Так, Вадзім Ларчанка, студэнт 4 курса Акадэміі мастацтваў, прапанаваў ідэю кароткага метра, які ўзнімае пытанне гвалту на вуліцы. Маладой спартсменцы-каратыстцы неабходна зразумець, дзе праходзіць мяжа паміж самаабаронай і агрэсіяй.

Адразу некалькі ідэй фільмаў, якія прагучалі падчас пітчынгу, былі прысвечаны дзіцячым траўмам і пераадоленню іх у дарослым узросце. Адметна, што тэма прагучала неаднойчы: моладзь цікавіцца ментальным здароўем і жадае адлюстраваць на экране, як неабходна ўважлівае стаўленне бацькоў да страхаў, жаданняў і мар дзяцей. Так, першакурсніца Акадэміі мастацтваў Аліса Лісок прапанавала канцэпцыю камедыі-прытчы «Ванька-пастух ды Іван-праграміст». Ідэя будучага фільма пайшла з наступнай гісторыі: хлопчык, які нарадзіўся ў вёсцы, марыць аб працы пастуха. Але школьная настаўніца яго высмейвае. Малады Іван вырашае адпавядаць стандартам соцыуму і абірае «правільную» прафесію: становіцца праграмістам — хлопцу гэта не прыносіць ні шчасця, ні задавальнення.

Адной з парад, якую сябры журы накіроўвалі амаль усім удзельнікам пітчынгу, было канкрэтызаванне ідэі. Сапраўды, сусвет кіно, асабліва прадзюсарскі напрамак — рэч жорсткая, зацікавіць трэба з першых секунд. Удзельнікамі пітчынгу сталі і больш вопытныя маладыя, якія паспелі ўжо атрымаць рэжысёрскі вопыт. Выпускнік Акадэміі мастацтваў Кірыл Халецкі ў мінулым годзе ўжо адзначыўся на «Лістападзе» ў конкурснай праграме кароткаметражных фільмаў. Там рэжысёр прадставіў свой фільм «Дарога». Зараз Кірыл прапанаваў ідэю філасофскага фільма пад інтрыгоўнай назвай «Ніхто не прыйдзе на маё пахаванне». Стужка павінна прымусіць гледача задумацца аб тым, наколькі вартае жыццё ў яго было.

А вось студэнт 4 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Максім Папоў звярнуўся да тэмы беларускага фальклору, сваю будучую стужку пад назвай «Чортава гара» ён плануе насыціць старажытнымі абрадамі, а таксама героямі этнасу. Адно з пытанняў, якое Максім узнімае ў сваім фільме: ці не забывае беларуская моладзь свае карані і культуру?

Сярод канцэпцый, якія сябры журы таксама пачулі падчас пітчынгу, былі містычныя стужкі, а таксама хорары. Адметна і тое, што ўсе ўдзельнікі конкурсу хацелі б зняць свае фільмы ў беларускіх лакацыях: плануюць задзейнічаць як сталіцу, так і глыбінку. Спадзяёмся, што ў наступным годзе «Лістапад» парадуе гледачоў цікавымі і запамінальнымі стужкамі маладых аўтараў.